# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 13 верасня 2001 года, чацвер, № 12 (1841)


СВЯТЫ





## Віват, студэнт!

Першага верасня для першакурснікаў БДУ ў Мінскім палацы спорту праводзілася традыцыйнае свята "Віват, студэнт!" Вечарына пачалася з вынасу штандараў факультэтаў і знаёмства з дэканамі, пасля чаго ўпершыню адбыўся ўрачысты вынас сімвалаў універсітэта — герба і сцяга, прынятых у 2000 годзе. Вельмі эфектна (дзякуючы супрацоўніцтву з групай байкераў "Жалезныя браты") было абстаўлена з'яўленне рэктара БДУ прафесара Аляксандра Уладзіслававіча Казуліна. Простыя і пранікнёныя словы яго ўрачыстай прамовы застануцца, напэўна, назаўсёды ў сэрцах тых, хто сёлета ўпершыню пераступіў парог універсітэта. Пасля гэтага з дапамогай старшыні Студэнцкага саюза Тараса Дзенісенкі першакурснікі прынялі клятву студэнта БДУ і атрымалі адзіны на ўсіх студэнцкі білет. Завяршыла ж урачыстую частку песня пра універсітэт.

Не менш насычанай была другая частка, падчас якой студэнты-першакурснікі змаглі азнаёміцца з усім спектрам творчых калектываў і цэнтраў, што ёсць ва універсітэце, а найбольшую цікавасць сярод гледачоў выклікала выступленне каманды КВЗ БДУ.

Радыё Белдзяржуніверсітэта "Юністар" прапанавала шматгадзінную танцавальную праграму са шматлікімі конкурсамі, сярод удзельнікаў якой былі групы "Фэнш", "Амега", "Гарбата ўдваіх", шоу-балет "Магія".

Увогуле, першакурснікі на працягу вечара знаходзіліся ў сапраўднай святочнай атмасферы, якая вось ужо трэці год запар ствараецца дзякуючы намаганням упраўлення па справах культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ, студэнт геафака*

*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

# ГЕОГРАФЫ СВЯТКУЮЦЬ НАВАСЕЛЛЕ



За апошнія два з паловай гады геафак пераязджаў тройчы. "Вандраванні" пачаліся з таго, што ў кастрычніку 1998 года будынак геаграфічнага факультэта быў закрыты на капітальны рамонт, а геафак часова перасяліўся ў перададзены БДУ будынак медінстытута. Потым, ужо сёлета, давялося пакінуць і гэты будынак: на яго месцы плануецца пабудаваць універсітэцкую бібліятэку. У выніку такога пераезду маёмасць кафедраў была перавезена ў гардэроб галоўнага корпуса, дэканат размясціўся тут жа на першым паверсе, а летнюю сесію географы здавалі ў аўдыторыях іншых факультэтаў. Зразумела, што ўсе гэтыя перадыслакацыі наклалі адбітак на навучальны працэс, выклікалі шмат чутак наконт далейшага размяшчэння геафака, таму абстаноўка была даволі нервовая. Нарэшце, 31 жніўня ў 17 гадзін 12 хвілін рэктар БДУ А.У. Казулін падпісаў акт прыёмкі корпуса геаграфічнага факультэта.

...А трэцяга верасня з самай раніцы пайшоў дождж, што, паводле прыкметы, вядзе да багацця. І ён наклаў адбітак на праграму: госці і студэнты перамясціліся ў хол геафака, дзе ў дзесяць гадзін музычныя пазыўныя — фанфары — абвясцілі ўсім аб пачатку цырымоніі ўрачыстага адкрыцця корпуса. Першым слова ўзяў рэктар БДУ прафесар А.У. Казулін, дзякуючы падтрымцы і непарушнаму слову якога географы атрымалі падарунак у выглядзе новага корпуса. Ён адзначыў, што зараз геафак з'яўляецца самым багатым факультэтам БДУ і дождж — сведчанне гэтаму. Пасля гэтага дырэктар УП "Армеец" І.В. Барысенка перадаў пажаданні студэнтам ад будаўнікоў і сімвалічны ключ ад корпуса — дэкану геафака, прафесару І.І. Пірожніку. А пасля выступлення В.П. Якушка — чалавека, лёс якога поўнасцю звязаны з геафакам, — у якім яна падзякавала ад імя ўсіх рэктару за падарунак і нагадала пра слаўныя традыцыі і ўклад у развіццё грамадства географаў і выпускнікоў геафака, слова ўзяў дэкан. Напрыканцы яго выступлення ключ ад корпуса быў перададзены студэнтам 5 курса геафака В.Д. Корсун і І.М. Сцішэўскаму. У сваім выступленні Корсун падзякавала за падарунак і запэўніла прысутных, што сваімі поспехамі студэнцтва адпрацуе выказаны давер.



Пад урачыстыя фанфары дэкан перарэзаў чырвоную стужку, і госці, сярод якіх быў віцэ-прэм'ер Рэспублікі Беларусь Міхаіл Дзямчук, разам са студэнтамі пачалі знаёміцца з новым корпусам, аздобленым нават лепей, чым рэктарат: грэчаская фірма "Гранітас" пастаўляла высакаякасны граніт для працы не толькі з абшараў Беларусі і СНД, але і з Афрыкі, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, усе драўляныя эле-

менты зроблены з дубовага масіву, сталы дастаўляліся пад заказ з Масквы, на замову выrabляліся і вельмі камфартабельныя крэслы. Словам, цяпер студэнты факультэта змогуць вывучаць геаграфію па месцах вытворчасці мэблі ў сваім корпусе. А сам корпус, што злучыў у сабе гісторыю (гэта, як і рэктарат, адзін з будынкаў, з якога пачынаўся БДУ) і сучаснасць, выглядае вельмі светлым і прыгожым.

Амаль праз гадзіну для студэнтаў празвінеў першы лекцыйны званок, і яны прыступілі да заняткаў у новым корпусе геафака.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ, адказны за інфармацыйны сектар маладзёжных арганізацый геафака*

*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*



КОНКУРСЫ

## БДУ ЗАПРАШАЕ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У КОНКУРСЕ

*30 кастрычніка 2001 года Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту спаўняецца 80 гадоў. З гэтай нагоды БДУ абвяшчае конкурс "Наш універсітэт" на лепшыя журналісцкія і мастацкія творы, прысвечаныя Белдзяржуніверсітэту.*

1. Конкурс праводзіцца па трох намінацыях:

— лепшы артыкул з гісторыі БДУ,

— лепшая публікацыя на тэму "БДУ сёння",

— лепшы мастацкі твор (апавяданне, верш, эсэ і г.д.), прысвечаны БДУ.

2. На конкурс прымаюцца матэрыялы студэнтаў, супрацоўнікаў і выпускнікоў БДУ, надрукаваныя ў 2001 годзе як у газеце "Беларускі ўніверсітэт", так і ў іншых выданнях.

3. Матэрыялы на конкурс для друку ў газеце "Беларускі ўніверсітэт" прадастаўляюцца ў машынапісным выглядзе ў аб'ёме не больш за 5 друкаваных старонак. Рэдакцыя газеты пакідае за сабой права адбору матэрыялаў для друку.

4. Матэрыялы да разгляду прымаюцца да 30 верасня 2001 года ў рэдакцыі газеты "Беларускі ўніверсітэт" (г. Мінск, 220080, вул. Бабруйская, д. 7, пакой 411, тэл. 209-53-45). Матэрыялы, прадстаўленыя пазней азначанага тэрміну, разглядацца не будуць.

5. Пераможцы конкурсу атрымаюць грашовыя ўзнагароджанні па кожнай з трох намінацый у наступных памерах:

І прэмія — 50 у.а.

ІІ прэмія — 30 у.а.

ІІІ прэмія — 15 у.а.

ШТО? ДЗЕ? КАЛІ?

## Тыдзень ведаў

З 1 па 7 верасня ў Белдзяржуніверсітэце праходзіў Тыдзень ведаў пад дэвізам "У XXI стагоддзе з годнай адукацыяй", у рамках якога на факультэтах праводзіліся сустрэчы з прафесарска-выкладчыцкім саставам, вядучымі навукоўцамі, дзеячамі навукі і адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## Сустрэча з рэктарам

Сустрэча рэктара БДУ з прадстаўнікамі грамадскіх маладзёжных арганізацый, старастату, студэнцкіх саветаў інтэрнатаў адбылася 5 верасня ў актавай зале Ліцэя БДУ. На сустрэчы ў адрас рэктара прагучалі самыя разнастайныя пытанні — ад побытавых праблем у інтэрнатах да перспектываў развіцця ўніверсітэта і пашырэння метадычнай базы для выкладчыкаў. Падчас мерапрыемства рэктар падтрымаў ініцыятыву зрабіць такія сустрэчы рэгулярнымі.

## Матэматыкі ў Празе

З 19 па 25 ліпеня ў Празе (Чэхія) праходзіла VIII Міжнародная матэматычная алімпіяда студэнтаў. У ёй прынялі ўдзел каля 200 студэнтаў з 21 краіны. Яны прадстаўлялі больш за 40 універсітэтаў.

З нашага ўніверсітэта на алімпіядзе было 8 чалавек. Яны атрымалі наступныя прызы: дыплом І ступені — 2 удзельнікі (Т. Ласы з ММФ, І. Лосеў з ФПМІ), дыплом ІІ ступені — 4 удзельнікі (Дз. Бадзягін, А. Кохан, А. Усніч з ФПМІ, А. Каранеў з ММФ), дыплом ІІІ ступені — 2 удзельнікі (А. Пагірніцкі з ФПМІ, Я. Радына з ММФ), сертыфікат — 1 індывідуальны ўдзельнік (М. Часалін з ММФ).

## Дапамагла алімпіяда

Звыш 300 чалавек з 41 краіны ўдзельнічала ў міжнароднай алімпіядзе па рускай мове, якая адбылася сёлета ў Маскве. А перамагла нашая зямлячка, выпускніца лідскай гімназіі № 1 Кацярына Хальпукова.

На сустрэчы ў Лідскім гарвыканкаме яе маці Галіне Іосіфаўне (дарэчы, настаўніцы рускай мовы) быў уручаны ліст-падзяка за выдатнае выхаванне дачкі. Кацярыну, яе настаўніцу Галіну Ганчарэнка і дырэктара гімназіі Наталлю Зайцаву ўзнагародзілі грашовымі прэміямі. Мэр Ліды Уладзімір Малец таксама ўручыў дзяўчыне, цяпер ужо студэнтцы філалагічнага факультэта БДУ, выяву з гербам роднага горада.

# "10" – ГЭТА "МОЦНАЯ ПЯЦЁРКА"

Мы віншуем нашых першакурснікаў. Тое, што яны па праву займаюць свае вучэбныя месцы, не выклікае сумненняў. Сярод залічаных аказаліся 881 медаліст, 25 маладых людзей, якія маюць дыпломы з адзнакай, 713 выпускнікоў ліцэяў або гімназій. Пазмагацца ім падчас здачы прыёмных экзаменаў усё ж давялося. Бо паступала ажно 2084 медалістаў агульнаадукацыйных школ і 113 пераможцаў міжнародных або рэспубліканскіх алімпіядаў, а таксама 1630 выпускнікоў ліцэяў і гімназій.

Сёлета ўпершыню падчас прыёмнай кампаніі ў БДУ ацэнка ведаў абітурыентаў ажыццяўлялася па 10-бальнай сістэме. Па словах адказнага сакратара прыёмнай камісіі БДУ Віктара Васільевіча Самахвала, эксперымент атрымаў станоўчую адзнаку. Дзяржаўная камісія, якая назірала за ходам уступных экзаменаў, зрабіла выснову, што гэтае новаўвядзенне дазволіла больш аб'ектыўна ацэньваць веды абітурыентаў і ў пэўнай ступені зменшыць іх эмацыянальна-псіхалагічную нагрузку пасля выстаўлення адзнак. На яго думку, у прынцыпе, гэта не новая сістэма. І раней, выстаўляючы "пяцёрку", гаварылі, што яна можа быць як "моцнай", так і "слабой". Цяпер "моцная пяцёрка" адпавядае 10 балам. "9" — гэта "звычайная пяцёрка", а "8" — гэта "пяцёрка з мінусам". Нездавальняючай адзнакай цяпер лічыцца "нуль". Дарэчы, "дзесятка" выстаўлялася ў гэтым годзе толькі ў 91 выпадку. А адзнака "нуль" — у 1149 выпадках (гэта 7 працэнтаў ад агульнай колькасці атрыманых адзнак).

Больш за ўсё "дзесятак" было выстаўлена па прадмеце "Чалавек і грамадства" — 21. 11 "дзесятак" — на пісьмовым экзамене па біялогіі, і 8 — на вусным тэсціраванні па матэматыцы. Паказальна, што найбольшую колькасць нездавальняючых адзнак абітурыенты атрымалі таксама па матэматыцы і біялогіі: на пісьмовым экзамене па біялогіі колькасць нездавальняючых адзнак дасягнула 19 працэнтаў ад агульнай колькасці, на пісьмовым экзамене па матэматыцы — 16 працэнтаў. Дрэнна справіліся абітурыенты таксама з пісьмовым тэсціраваннем па беларускай мове і літаратуры (таксама 16 працэнтаў нездавальняючых адзнак) і рускай мове і літаратуры (12 працэнтаў нездавальняючых адзнак). А менш за ўсё нездавальняючых адзнак атрымалі абітурыенты, якія здавалі пры паступленні экзамен па замежных мовах.

Сёлета выпускнікам сельскіх школ 2001 года, якія пастаянна пражываюць у сельскай мясцовасці, пры паступленні на ўсе спецыяльнасці і формы навучання прыёмнай камісіяй дадаткова налічваліся тры балы.

У выніку здачы ўступных экзаменаў у гэтым годзе ў лік студэнтаў трапілі 155 выпускнікоў сельскіх школ, што складае 8 працэнтаў ад агульнай колькасці залічаных, і 1710 гараджан. Аднак працэнт паступіўшых ад агульнай колькасці тых, хто падаў заявы, аказаўся аднолькавым як сярод гарадскіх, так і сярод сельскіх выпускнікоў: з агульнай колькасці гарадскіх абітурыентаў паступілі 30 працэнтаў, і з сельскіх абітурыентаў паступілі тыя самыя 30 працэнтаў.

Прыёмная камісія пайшла таксама насустрач некаторым з абітурыентаў, якія прадэманстравалі на экзаменах добрыя вынікі, але не прайшлі па конкурсе. Паколькі іх сацыяльнае становішча не дазваляе ім вучыцца на платнай форме навучання, іх вырашылі залічыць на бюджэтныя месцы звыш кантрольных лічбаў прыёму.

За час правядзення ўступных экзаменаў у БДУ ў прыёмную камісію было пададзена 47 апеляцый. У 13 выпадках рашэннем апеляцыйнай камісіі экзаменацыйныя адзнакі абітурыентаў былі зменены ў бок іх павелічэння. Больш за ўсё такіх выпадкаў аказалася пасля пісьмовага экзамена па матэматыцы — 7.

У ходзе ажыццяўлення кантролю за работай прыёмнай камісіі і правядзеннем уступных экзаменаў у БДУ парушэнняў нарматыўна-прававых актаў, якія вызначаюць правілы і парадак прыёму ў гэтую навучальную ўстанову, выяўлена не было. Такая выснова змяшчаецца і ў справаздачы дзяржаўнай камісіі па кантролі экзаменаў у БДУ.

Нагадаем, што ў 2001 годзе прыём у Белдзяржуніверсітэт праводзіўся на 17 факультэтаў і Міжнародны гуманітарны інстытут па 49 спецыяльнасцях. Упершыню ўведзены спецыяльнасці "лячэбна-прафілактычная справа", "дакументазнаўства і дакументацыйнае забеспячэнне кіравання", "кітайская мова і літаратура".

Пры плане прыёму ў 1850 чалавек было пададзена 6387 заяваў. Найбольшы конкурс склаўся на спецыяльнасці "сучасная англійская мова і літаратура" — больш за 10 чалавек на адно месца, жадаючых вывучаць кітайскую мову і літаратуру было каля 6,5 на месца. Патрэбна адзначыць высокі конкурс на ўсе спецыяльнасці, звязаныя з вывучэннем замежных моў і літаратуры (практычна ўсюды больш за 5 чалавек на месца).

Устойлівай папулярнасцю ў абітурыентаў карыстаецца эканамічная тэорыя — амаль 6,5 чалавек на адну вакансію. Эканоміка — 5,41, сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны — 5,11 прэтэндэнтаў на адно месца.

Цікава, што конкурс на спецыяльнасці "беларуская мова і літаратура" склаў 3,39 чалавека на месца, а на "рускую мову і літаратуру" — 2,7 чалавека на месца.

Перспектыўная спецыяльнасць "інфармацыя і камунікацыя" прыцягнула ў 6 разоў больш запланаванай колькасці абітурыентаў. А прахадны бал сярод гарадскіх выпускнікоў школ тут склаў 26 з 30 магчымых, сярод выпускнікоў з сельскіх школ — адпаведна 23 з 30.

Таму тыя абітурыенты, якія сталі студэнтамі, могуць па праву назваць сябе яшчэ і шчаслівчыкамі. Асабліва студэнты біялагічнага, геаграфічнага і фізічнага факультэтаў, якія селі за новыя парты ў новых навучальных карпусах.

*Вольга АНІНА*



*Першакурснікі на свяце «Віват, студэнт!» у Палацы спорту*

*Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

## Інфармацыя аб прахадным бале на дзённую бюджэтную форму навучання ў Беларускі дзяржаўны універсітэт у 2001 г.

| Назва спецыяльнасці (спецыялізацыі) | Конкурс | Прахадны бал выпускнікоў горада | Прахадны бал выпускнікоў сяла |
|---|---|---|---|
| Біялогія | 4,26 | 24 з 34* | 21 з 34* |
| Экалогія (біялагічны факультэт) | 4,26 | 24 з 34* | 21 з 34* |
| Геаграфія | 2,63 | 19 з 34* | 16 з 34* |
| Геалогія і разведка карысных выкапняў | 2,63 | 19 з 34* | 16 з 34* |
| Экалогія (геаграфічны факультэт) | 3,40 | 16 з 34* | 13 з 34* |
| Гісторыя | 2,46 | 19 з 40 | 16 з 40 |
| Гісторыка-архівазнаўства | 2,46 | 19 з 40 | 16 з 40 |
| Дакументазнаўства, дакументацыйнае забеспячэнне кіравання | 2,46 | 19 з 40 | 16 з 40 |
| Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры | 2,46 | 19 з 40 | 16 з 40 |
| Журналістыка | 4,18 | 34 з 45** | 31 з 45** |
| Інфармацыя і камунікацыя (факультэт журналістыкі) | 3,13 | 32 з 45** | 29 з 45** |
| Літаратурная работа | 2,93 | 33 з 45** | 30 з 45** |
| Міжнародная журналістыка | 3,33 | 34 з 45** | 31 з 45** |
| Матэматыка | 2,75 | 19 з 34* | 16 з 34* |
| Механіка | 2,75 | 19 з 34* | 16 з 34* |
| Фізіка | 2,20 | 19 з 34* | 16 з 34* |
| Сучасная англійская мова і літаратура | 10,08 | 30 з 40 | 27 з 40 |
| Беларуская мова і літаратура | 3,39 | 17 з 30 | 14 з 30 |
| Сучасная італьянская мова і літаратура | 5,93 | 28 з 40 | 25 з 40 |
| Кітайская мова і літаратура | 6,50 | 29 з 40 | 26 з 40 |
| Сучасная нямецкая мова і літаратура | 5,67 | 26 з 40 | 23 з 40 |
| Руская мова і літаратура | 2,70 | 18 з 30 | 15 з 30 |
| Славянскія мовы і літаратуры | 4,00 | 21 з 30 | 18 з 30 |
| Сучасная французская мова і літаратура | 4,67 | 23 з 40 | 20 з 40 |
| Міжнародныя адносіны | 4,11 | 31 з 40 | 27 з 40 |
| Міжнароднае права | 3,84 | 32 з 40 | 28 з 40 |
| Мытная справа | 3,84 | 26 з 40 | 23 з 40 |
| Менеджмент (ФМА) | 3,47 | 30 з 40 | 27 з 40 |
| Лінгвакраіназнаўства | 3,00 | 27 з 40 | 24 з 40 |
| Сусветная эканоміка і міжнародныя эканамічныя адносіны | 5,11 | 32 з 40 | 29 з 40** |
| Актуарная матэматыка | 3,70 | 26 з 34 | 23 з 34 |
| Інфарматыка | 3,70 | 26 з 34 | 23 з 34 |
| Прыкладная матэматыка | 3,70 | 26 з 34 | 23 з 34 |
| Эканамічная кібернетыка | 3,70 | 26 з 34 | 23 з 34 |
| Радыёфізіка | 2,28 | 23 з 34 | 20 з 34 |
| Фізічная электроніка | 2,28 | 23 з 34 | 20 з 34 |
| Камерцыйная дзейнасць | 3,13 | 26 з 34 | 23 з 34 |
| Медыка-сацыяльная дапамога насельніцтву | 4,13 | 20 з 34 | 17 з 34 |
| Лячэбная справа | 3,67 | 21 з 34 | 18 з 34 |
| Менеджмент сацыяльнай сферы | 3,27 | 20 з 34 | 17 з 34 |
| Фармацыя | 3,84 | 30 з 34 | 27 з 34 |
| Інфармацыя і камунікацыя (ФФСН) | 6,00 | 26 з 30 | 23 з 30 |
| Псіхалогія | 4,15 | 29 з 40 | 26 з 40 |
| Сацыялогія | 4,70 | 24 з 30 | 21 з 30 |
| Філасофія | 4,07 | 23 з 30 | 20 з 30 |
| Хімія | 3,16 | 25 з 34 | 22 з 34 |
| Хімія лекавых злучэнняў | 3,16 | 25 з 34 | 22 з 34 |
| Хімічная экалогія | 3,16 | 25 з 34 | 22 з 34 |
| Менеджмент (ЭФ) | 4,41 | 29 з 40 | 26 з 40 |
| Эканоміка | 5,41 | 29 з 40 | 26 з 40 |
| Эканамічная тэорыя | 6,41 | 29 з 40 | 26 з 40 |
| Паліталогія | 4,65 | 30 з 40 | 27 з 40 |
| Правазнаўства | 3,14 | 24 з 40 | 21 з 40 |
| Эканамічнае права | 3,12 | 22 з 40 | 19 з 40 |

*Заўвагі:*
* з улікам чатырох дадатковых балаў па замежнай мове для жадаючых;
** з улікам пяці дадатковых балаў па творчым тэсціраванні для жадаючых.

**МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА**

# ПРЫНЯЦЦЕ РАШЭННЯ – ГЭТА НАВУКА!

У жніўні на эканамічным факультэце БДУ прайшоў беларуска-нямецкі семінар “Тэорыя прыняцця рашэнняў” (Decision Theory), прымеркаваны да 80-годдзя БДУ. На гэтым навуковым мерапрыемстве былі падведзеныя вынікі 10-гадовага супрацоўніцтва навукоўцаў БДУ і Магдэбургскага універсітэта ў азначаным навуковым накірунку. Тэорыя прыняцця рашэнняў — сучасная дысцыпліна на мяжы матэматычнай эканомікі і сістэмнага аналізу. Без гэтай тэорыі не прымаецца сёння ніводнае значнае рашэнне ў эканамічнай палітыцы і менеджменце.

Вось і на названым семінары побач з тэарэтычнымі даследаваннямі (даклады прафесара Э. Гірліха “Праблемы лінейнага ранжыравання”, дацэнта М. Хёдыга “Субмадулярная аптымізацыя”, беларускага аспіранта ў Магдэбургскім універсітэце А. Гарбача “Палітоны цыклаў”) даследаваліся і важныя прыкладныя праблемы (даклады беларускага аспіранта Франкфурцкага універсітэта С. Новіка “Прыняцце рашэнняў на рынку каштоўных папераў”, асістэнта БДУ П. Швайко “Перспектыўная ёмістасць беларускага рынку каштоўных папераў”).

Вялікія дыскусіі выклікала абмеркаванне сумеснага даклада рэктара нашага універсітэта прафесара А.У. Казуліна і прафесара М.М. Кавалёва “Тэорыя рэйтынгаў”. На думку нашых нямецкіх гасцей, у дакладзе закладзены асновы новага навуковага накірунку, які будзе мець самы шырокі ўжытак у палітыцы (рэйтынгі дзяржаваў, фірмаў, банкаў), адукацыі (рэйтынгі ВНУ), інавацыі (рэйтынгі навуковых праектаў).

Па выніках семінару ў Германіі будзе выдадзены калектыўны зборнік працаў. Падрыхтавана дамова аб супрацоўніцтве нашага і Магдэбургскага універсітэтаў, якая будзе падпісаная падчас юбілею БДУ, куды запрошаны старшыня кансіліуму (аб'яднанага савета) Магдэбургскага універсітэта прафесар Э. Гірліх, які, дарэчы, 30 гадоў таму навучаўся ў нас у аспірантуры.

*Аляксандр ПЛЮСКОЎ,*
*магістр эканамічнага факультэта*

**ПОСТФАКТУМ**

# “Розныя – роўныя”

У свеце шмат праблемаў, якія мы павінны і можам вырашаць толькі разам: ад праблемы “бацькоў і дзяцей” да праблемы выратавання свету ад ядзернай катастрофы. Галоўнае — пачаць нешта рабіць ужо зараз.

Студэнцкі актыў прафсаюзнага камітэта студэнтаў БДУ (у асобах Алесі Майструк, Надзеі Кусянковай, Аляксея Зусава, Віталя Мічкова і Людмілы Пішчук) летам арганізаваў “круглы стол” для моладзі. Мерапрыемства адбылося ў рамках сацыяльнай праграмы “NETWORK” пры падтрымцы фонду Каўнтэрпарт (ЗША) і міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання “Розныя — роўныя” (Мінск, Беларусь). На 4-гадзінны “круглы стол” у галоўным корпусе БДУ сабраліся маладыя актывісты для таго, каб вызначыць кола праблемаў, звязаных з засяленнем і пражываннем студэнтаў у інтэрнатах БДУ, а таксама распрацаваць магчымыя шляхі іх вырашэння.

Гэты “круглы стол” адрозніваўся ад звыклых “кабінетных нарадаў” тым, што праца на ім вялася з выкарыстаннем новых метадаў. Удзельнікі маглі знаёміцца, вырашаць пытанні ў форме гульні. Хаця такое мерапрыемства — першы досвед арганізатарскай работы такога кшталту ў актыву прафкама студэнтаў БДУ, як паказалі водгукі ў анкетах удзельнікаў, са сваёй задачай арганізатары справіліся паспяхова. Вынікі “круглага стала” былі прадстаўлены старшыні прафсаюзнага камітэта студэнтаў Н.М. Радзевіч. І, наколькі вядома, канкрэтныя дзеянні ўжо прадпрынятыя пры арганізацыі засялення студэнтаў у інтэрнаты БДУ сёлета.

*Віталь МІЧКОЎ,*
*старшыня сацыяльнай камісіі прафкама студэнтаў БДУ*

# МОВА МАСТАЦТВА НЕ ВЕДАЕ МЕЖАЎ

Міжнародная выстава "Майстар" пачала працаваць 4 верасня ў мінскім Палацы мастацтва. Гэты праект аб'яднаў мастакоў з розных краін свету — Беларусі, ЗША, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны. На выставе прадстаўлены карціны Марэка Станялевіча, Віктара Сахно, Аляксандра Ксяндзова, Пшэмыслава Тышкевіча ды іншых вядомых аўтараў.

Выстава працягнецца два тыдні. На 6 верасня было запланавана тэатралізаванае шоу з удзелам агенцтва Сашы Варламава "Universal Models", а 8 верасня адкрыўся аўкцыён, на якім можна было набыць карціны мастакоў, а таксама атрымаць прызы і падарункі ад спонсараў праекта.

На ўрачыстым адкрыцці выставы яе дырэктар Сяргей Крыштаповіч выказаў вялікую падзяку ўсім, хто дапамагаў у здзяйсненні гэтага праекта. Асабліва была адзначана роля Белдзяржуніверсітэта і асабіста рэктара Аляксандра Уладзіслававіча Казуліна. Сяргей Крыштаповіч падзякаваў яму за ўдзел у арганізацыі выставы, падтрымку беларускага мастацтва і творчай інтэлігенцыі, а таксама павіншаваў прафесарска-выкладчыцкі калектыў, усіх супрацоўнікаў і студэнтаў з 80-годдзем з дня заснавання універсітэта.

На адкрыцці выставы сярод гасцей можна было ўбачыць пасла ЗША Майкла Козака, прарэктара БДУ Алега Антонавіча Яноўскага, польскага мастака Марэка Станялевіча, мастацтвазнаўцу Алу Нароўскую (якая калісьці скончыла БДУ, а цяпер працуе сакратаром Міжнароднага аб'яднання мастакоў і мастацтвазнаўцаў "Майстар").

Падчас сустрэчы гучала шмат добрых, цёплых словаў. Усе прысутныя зразумелі: адкрыццё такой выставы — яскравае сведчанне таго, што для мастацтва сапраўды няма межаў. І зусім не абавязкова ведаць мову, на якой размаўляе мастак, каб зразумець яго карціны. Тут пануе адна для ўсіх мова прыгажосці, мова мастацтва.

*Кацярына ДЗЯМЕНЦЬЕВА,*
*студэнтка факультэта журналістыкі*



*На малюнку:*
*Анджэй Мачыдлоўскі.*
*Wandering III. 2001.*
*Камп'ютэрная графіка.*



# *Беларуская мода на берлінскім подыуме*

Агенцтва Сашы Варламава "Universal Models" пры БДУ ў жніўні гэтага года прымала ўдзел у фестывалі моды "Вялікі Курфюрстэндам" у Берліне. Гэты фестываль праходзіць адзін раз у два гады на вуліцы Курфюрстэндам, адкуль і пайшла назва фестывалю. Дарэчы, сам Саша Варламаў сёлета быў рэжысёрам гэтага шоу. Мадэльерамі розных краін свету была прадстаўлена тысяча камплектаў адзення, 750 мадэлей бралі ўдзел у гэтым шоу. Подыум Курфюрстэндама, агульнай даўжынёй 1111 метраў, на якім праходзіў паказ, з'ўляецца самым вялікім у свеце і занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса.

Дзвесце беларускіх дзяўчат дэманстравалі калекцыі адзення з лёну, якія падрыхтавалі нашы маладыя дызайнеры. А калекцыі былі незвычайныя — з чароўнымі назвамі: "Пачуццёвасць кветак" І. Андрасюк і Н.Нікіцінай (Брэст), "Казка на ноч" А.Будрык (Мінск) і іншыя.

З гонарам можна казаць і пра тое, што адкрыццё і закрыццё фестывалю адбывалася пад гукі музыкі з беларускага конкурсу "Млын моды". На шоу прысутнічаў пасол Беларусі ў Германіі спадар Скварцоў, які адзначыў, што з'яўленне беларусаў на гэтым подыуме — гэта адзін з першых прарываў нашай краіны ў свет моды.





Я сустрэлася з Сашам Варламавым пасля яго вяртання ў Мінск. Ён і сёння яшчэ знаходзіцца пад уражаннем ад гэтай паездкі. Праца зроблена вялікая, выдаткавана шмат часу і сіл, але самае галоўнае — што ўсё гэта недарэмна. Нямецкія газеты амаль усе артыкулы, прысвечаныя "Вялікаму Курфюрстэндаму", пачыналі словамі: "Сапраўдным упрыгожаннем подыума фестывалю былі беларускія мадэлі..." Значыць, нашых дзяўчат заўважылі, адзначылі беларускія калекцыі, мы заявілі пра сябе ў свеце моды.

Наконт планаў на будучыню Саша Варламаў сказаў наступнае: "Я жыву цяперашнім днём. Я кідаю камень удалячынь, каб праз некаторы час падняць яго і кінуць яшчэ далей". Разумна, а галоўнае, практычна. Спадзяюся, што задумкі Сашы Варламава спраўдзяцца, і калі-небудзь Беларусь будзе стаяць нароўні з вядомымі сёння краінамі — заканадаўцамі сусветнай моды.

*Кацярына ДЗЯМЕНЦЬЕВА*

*На фотаздымку: мадэлі агенцтва Сашы Варламава "Universal Models" у Берліне*

# *Бібліятэчныя таямніцы*

*У маі гэтага года (№ 10 за 31 мая 2001 года) наша газета пачала змяшчаць главы з кнігі былога дырэктара бібліятэкі Ірыны Уладзіміраўны Арахоўскай "Бібліятэчныя таямніцы", якая рыхтуецца да друку ў БДУ. Сёння мы працягваем публікаваць выбраныя старонкі з гэтай кнігі.*

*Тыя, хто пазнаёміўся з папярэдняй публікацыяй, мабыць, пераканаўся, што гісторыя бібліятэкі не толькі вельмі моцна зніtаваная з гісторыяй усяго універсітэта. Летапіс бібліятэкі – гэта яшчэ і мноства самых разнастайных сюжэтаў – сумных і вясёлых, сур'ёзных і недарэчных.*

## БІБЛІЯТЭКА Ў ГАДЫ ВАЙНЫ

Перадваенныя гады бібліятэкі кепска асветленыя ў гісторыі. Аднак, напэўна, такія матэрыялы ёсць, трэба іх толькі пашукаць.

Вайна прынесла вялікую бяду ў нашую краіну. Для універсітэта вайна стала не меншым выпрабаваннем, чым для ўсяго народа.

Гітлераўцы расстралялі дацэнтаў універсітета, чытачоў бібліятэкі Я. Зубковіча, А. Вязава, М. Пелепа, Г. Сагаловіча, замучылі прафесара М. Сталярова, якія не паспелі эвакуіравацца. Зараз у двары універсітэта стаіць памятны знак выкладчыкам і студэнтам, якія не вярнуліся з вайны.

Вясна 1941 года. Універсітэт рыхтаваўся адзначыць сваё 20-годдзе. Бібліятэка падрыхтавала вялікую кніжную выставу, якая распавядала пра жыццё універсітэта і поспехі ў навучальным і навуковым працэсе. 24 чэрвеня павінны былі пачацца юбілейныя святкаванні. Ва універсітэце ішлі дзяржаўныя іспыты. Як заўжды, у гэтыя дні панавала ажыўленне ў навучальных карпусах. Але раніца 22 чэрвеня 1941 года прынесла народу цяжкую вестку: вайна!

Ва універсітэцкім скверыку запалалі вогнішчы. Фашысты палілі каштоўныя кнігі — унікальныя помнікі беларускай культуры, якія з такой любоўю збіраў калектыў бібліятэкі. Калючы дрот, доты і дзоты акружылі універсітэцкі гарадок.

У першыя ж дні вайны многія выкладчыкі і студэнты БДУ — нашыя чытачы — пайшлі на фронт. Частка трапіла ў партызанскія атрады, частка эвакуіравалася ў тыл.

У 1943 годзе была прынята пастанова ўрада пра аднаўленне працы Белдзяржуніверсітэта на станцыі Сходня Кастрычніцкай чыгункі пад Масквой. Пад навучальны корпус быў перададзены будынак школы, а таксама 40 дач — для размяшчэння прафесарска-выкладчыцкага саставу. У будынку школы знайшлося і невялікае памяшканне для бібліятэкі.

11 кастрычніка 1943 года ў БДУ пачаліся заняткі. Першымі студэнтамі-чытачамі сталі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, салдаты і партызаны, якія атрымалі раненні на фронце ці ў варожым тыле. На Сходню яны прыязджалі прама са шпіталяў. Напрыклад, старшы лейтэнант Іван Мележ быў паранены ў руку, яго залічылі на трэці курс філалагічнага факультэта.

Тыя, хто прыйшоў з франтоў, вельмі хацелі вучыцца, нагнаць прапушчаны час. Часцяком яны давалі бібліятэкару аркушы са слупкамі шматлікіх назваў кніг і аўтараў, выведзеныя роўным вучнёўскім почыркам.

Жыццё бібліятэкі таго часу адлюстравалася ва ўспамінах тагачаснага дырэктара Міхаіла Фядотавіча Жаўрыда, які потым быў рэктарам Мазырскага настаўніцкага інстытута, рэктарам Мінскага педінстытута, намеснікам міністра адукацыі БССР, рэктарам Мінскага інстытута замежных моў. Выйшаўшы на пенсію, ён працаваў дацэнтам на геаграфічным факультэце БДУ.

"За час працы дырэктарам бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта я займаўся камплектаваннем бібліятэкі шляхам брацкай дапамогі маскоўскіх ВНУ, якія ахвотна нам адкладалі дублетныя экземпляры кніг. Да ліку навучальных установаў Масквы, якія ахвотна адкладалі нам усё мажлівае, трэба аднесці бібліятэку і кабінеты Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, педінстытута імя У.І. Леніна, педінстытута замежных моў, абласнога інстытута, інстытута народнай гаспадаркі імя Пляханава. Апрача таго, нам вельмі шмат дапамагала дзяржаўная бібліятэка імя У.І. Леніна.

Паралельна з гэтай працай даводзілася без перапынку купляць рэдкую літаратуру ў букіністычных крамах г. Масквы, на што рэктарат выдзяляў у мае распараджэнне прыкладна 70 % свайго бюджэту.

Усю закупленую і сабраную літаратуру ў Маскве транспартавалі студэнты электрычкай. Кожную суботу ў маё распараджэнне выдзялялася 30-40 студэнтаў, якія разам са мной з'язджалі ў Маскву, і кожны прывозіў 2-3 пачкі літаратуры. Гэтыя кнігі беспераліпынна апрацоўвалі 2 бібліятэкары. Трэба адзначыць, што мы тады ўжо мелі бібліятэку, прыкладна 70-80 тыс. Перад ад'ездам з Масквы ў Мазыр я здаў бібліятэку прафесару М.Р. Ларчанку, які заняў маю былую пасаду. Яшчэ я павінен прыгадаць, што мне са студэнтамі давялося выконваць урадавае заданне па нарыхтоўцы 10 тыс. куб. м дроваў для Масквы, дзе я быў прыбіты трыма хвоямі, у сувязі з тым, што студэнты дзве хвоі павесілі на трэцюю, гэты факт вядомы былому сакратару партарганізацыі тав. Мележу, члену партбюро Ларчанку М.Р. і выкладчыку беларускай мовы тав. Жыркевічу, які ў той дзень, калі здарылася няшчасце, разам са мной кіраваў групай студэнтаў, занятай на лесанарыхтоўцы".

Гэты дакумент захоўваецца ва універсітэцкай бібліятэцы.

Міхась Рыгоравіч Ларчанка на пасадзе дырэктара быў зусім нядоўга. Хутка на станцыю Сходня Міністэрства адукацыі накіравала дырэктарам бібліятэкі Разалію Герасімаўну Любіну. Ёй давялося выконваць самую цяжкую пасляваенную працу ў бібліятэцы. Яна пачала працаваць на Сходні ў 1944 годзе і ўсе намаганні і веды сканцэнтравала на галоўным кірунку — камплектаваць фонд, варты універсітэта. У Падмаскоўі яна, нібы каштоўную знаходку, прымала кожную кнігу. Сама вяла ўлік і апрацоўку літаратуры. А калі быў вызвалены Мінск, перавезла ўсе свае набытыя кнігі.

У 1946 годзе ў фондзе універсітэцкай бібліятэкі налічвалася 20 тыс. кніг. Гэта разыходзіцца з тымі звесткамі, якія падае М. Жаўрыд. Але гэта і зразумела: ён прыводзіў звесткі "на вока", а Разалія Герасімаўна спасылалася на інвентарную кнігу.

Разалія Герасімаўна падтрымлівала сувязь з бібліятэкай да глыбокай старасці. Ёй было 93 гады, калі яна сышла з жыцця ў 1997 годзе.

Р.Г. Любіна была ўзнагароджана медалямі "За доблестный труд в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.", "За доблестный труд в ознаменование 100-летия со дня рождения В.И. Ленина". Яе ўзнагароджвалі шматлікімі граматамі Міністэрства адукацыі і рэктарата. Мела яна і Знак Міністэрства культуры "За отличную работу". Яе ўклад у развіццё бібліятэкі пасляваенных гадоў цяжка пераацаніць.

## БІБЛІЯТЭКАР ПАСМІХАЕЦЦА

Мне хочацца, каб бібліятэкара ўяўлялі не нейкім насупам у акулярах, які глядзіць спадылба. Ён чалавек здольны, цікаўны, а галоўнае — умее цаніць гумар. Бібліятэчны гумар такі ж своеасаблівы, як і англійскі — не да ўсіх даходзіць як з-за спецыфікі ладу мыслення, так і з-за асаблівасцяў прафесійнай мовы.

Удалося, напрыклад, занатаваць крыху з выказванняў студэнтаў наконт прачытаных кніг:

*В Робинзоне встречаются качества человеческой буржуазии.*

*У Золя умерла бабушка — это тоже огорчение для семьи.*

*Американская литература реакционная: воспевает мятежи, грабежи.*

Была і спроба стварыць "Тлумачальны слоўнік студэнта":

*Канспект — запісы, якія лёгка пішуцца і цяжка чытаюцца.*

*Галоп — тэмп чытання кніг, лекцый у канцы семестра.*

*Аднадумца — адзіны ў групе, хто мае канспект.*

*Вольны час — час паміж сесіямі.*

*Ідэаліст — першакурснік.*

*Студэнт — дадатак да шпаргалкі.*

Бібліятэкар запісвае выказванні студэнтаў, якія стаяць у чарзе па кнігі ў зале:

*Мадам, а я и не знал, что вы мужчина!*

*Хватит плестись в конце, пора плестись на передовом крае!*

# Крым – гэта мора, паветра... І мноства кавярняў

Летні адпачынак і аздараўленне студэнцкай моладзі — адзін з накірункаў дзейнасці Студэнцкага саюза Белдзяржуніверсітэта. Сёлета нашых студэнтаў гасцінна прымала база адпачынку "Штармавое", якая размяшчаецца ў гарадку Штармавое Сакскага раёна Крыма.

Штармавое — выдатнае месцейка! Гарадок невялікі, дзівосна прыгожы, з цудоўнай прыродай, здаровым паветрам і чыстым морам. З харчаваннем праблем ніякіх — навокал мноства кавярняў, дый месцаў для адпачынку было шмат. Разам з намі адпачывала моладзь з Масквы, Пíцера, Кіева, Харкава. Асаблівы каларыт у наш адпачынак прыўнёс фестываль нефармальнай моладзі "Казанціп", які адбываўся ў трох кіламетрах ад нашай базы.

*Андрэй СОЎПЕЛЬ,*
*студэнт III курса ФПМІ*




## АБ'ЯВЫ

### УСТАНОВА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА "НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ"

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

галоўнага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяроддзяў;

старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі тонкіх плёнак;

навуковага супрацоўніка сектару агнегасячых матэрыялаў.

*Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Дакументы прымаюцца па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.*

### УСТАНОВА БДУ "НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ЦЭНТР ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ"

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

загадчыка навукова-даследчай лабараторыі (НДЛ) статыстычнага аналізу і мадэліравання (1);

загадчыка НДЛ праблем бяспекі інфармацыйных тэхналогій (1);

старшага навуковага супрацоўніка НДЛ статыстычнага аналізу і мадэліравання (1);

старшага навуковага супрацоўніка НДЛ матэматычных метадаў абароны інфармацыі (1).

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220050, г. Мінск, прасп. Ф. Скарыны, 4, п. 337, ННДЦ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, тэл. 209-50-42.*

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Часопіс для вас

Дзеля прапаганды і далейшага развіцця ў Беларусі навукова-тэхнічнай творчасці, спрыяння больш эфектыўнаму ўкараненню ў айчынную вытворчасць новых распрацовак і прагрэсіўных тэхналогій, актывізацыі такой працы на прадпрыемствах і ў арганізацыях Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па навуцы і тэхналогіях, Нацыянальная Акадэмія навук Беларусі, Вышэйшы атэстацыйны камітэт Беларусі, Беларускае таварыства вынаходцаў і рацыяналізатараў выступілі заснавальнікамі рэспубліканскага штомесячнага навукова-практычнага часопіса "Изобретатель".

Гэтае выданне заклікана стаць злучальным інфармацыйным мостам паміж навукай і вытворчасцю, агульнарэспубліканскай трыбунай для навукоўцаў, інжынераў, кіраўнікоў, рацыяналізатараў і наватараў вытворчасці, бізнесменаў, студэнтаў, народных умельцаў. Апрача разнастайнай навукова-тэхнічнай інфармацыі пра новыя вырабы і тэхналогіі, энергазберажэнне, у часопісе будуць публікавацца кансультацыі юрыстаў і патэнтазнаўцаў, афіцыйныя дакументы па пытаннях навукова-тэхнічнага развіцця краіны, звесткі пра абарону кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, будуць праводзіцца конкурсы на эфектыўнае творчае вырашэнне канкрэтных вытворчых праблем, лепшыя арыгінальныя вырабы народных умельцаў і г.д.

Кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый! Падпіска на рэспубліканскі часопіс "Изобретатель" — гэта не толькі найлепшы падарунак вашым інжынерам, тэхнологам, майстрам і вынаходнікам, але і ваш уклад у развіццё навукова-тэхнічнай творчасці ў Беларусі, актыўнае ўкараненне новых прагрэсіўных распрацовак у айчынную вытворчасць. Мы запрашаем да актыўнага супрацоўніцтва навукоўцаў Белдзяржуніверсітэта.

Падпіска прымаецца ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь. Падпісны індэкс для прадпрыемстваў і арганізацый — 00248, для індывідуальных падпісчыкаў — 74896.

*Павел СТАСЕВІЧ,*
*галоўны рэдактар часопіса*

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырванаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана да друку ў 12.00*

*13 верасня*
*Зак. 526*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская. 7. паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.*

**Рэдактар Т.М. КАЗАК**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Юрыя Жукава*